www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

1 снежня 2005 года, № 21 (1929)

БДУ-NEWS

## КАБ АТРЫМАЦЬ ДЫПЛОМ “З АДЗНАКАЙ” — ЛІЧЫЦЕ БАЛЫ

По просьбе Беларускага дзяржаўнага універсітэта Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь паведаміла пра парадак выдачы выпускнікам вышэйшых навучальных установаў дыплома “з адзнакай” у адпаведнасці з крытэрыямі ацэнкі ведаў па 10-бальнай сістэме (ліст № 04-01-11/2487/дс ад 08.11.2005 г.).

Паводле гэтага ліста, дыплом “з адзнакай” выдаецца студэнтам, якія атрымалі па выніках вывучэння ўсіх дысцыплін навучальнага плана спецыяльнасці, праходжання практык не менш за 75 % адзнак 10 (дзесяць) і 9 (дзевяць) балаў, а па астатніх дысцыплінах і практыках навучальнага плана спецыяльнасці — адзнакі 8 (восем), 7 (сем) і атрымалі па выніках канчатковай атэстацыі адзнаку 10 (дзесяць) альбо 9 (дзевяць) балаў.

## У ДАПАМОГУ АКТЫВІСТАМ

***6 снежня адбудзецца злет прафоргаў першага курса ўсіх факультэтаў БДУ, старшынь прафбюро студэнтаў і членаў прафкама студэнтаў.***

У плане мерапрыемства — выступы намесніка старшыні ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі **Р. Дапіры** “Аб дзейнасці беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі па выкананні рашэння V з’езда ФПБ і IV з’езда галіновага прафсаюза”, галоўнага тэхнічнага інспектара працы ЦК камітэта прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі **М. Лясун** “Ахова працы, здароўя, арганізацыя бяспечных умоў падчас правядзення навучальнага працэсу” і загадчыка аддзялення прававой абароны, прававога інспектара працы **Л. Манюк** “Аб прававой дапамозе членам арганізацыі”.

**По больш падрабязную інфармацыю звяртайцеся ў пярвічную прафсаюзную арганізацыю студэнтаў БДУ па тэл. 206-62-33, 226-59-57.**

**Сняжана ЛІСОЎСКАЯ**

ПАДЗЕІ

## МІНІСТР АДУКАЦЫІ СУСТРЭЎСЯ З АКТЫВАМ СТУДЭНТАЎ



*24 лістапада ў зале пасяджэнняў Вучонага савета БДУ адбылася сустрэча міністра адукацыі Аляксандра РАДЗЬКОВА з прадстаўнікамі студэнцкага актыву ВНУ краіны. У мерапрыемстве прынялі ўдзел намесніца міністра адукацыі Таццяна КАВАЛЁВА, рэктар нашага універсітэта Васіль СТРАЖАЎ, рэктар БДЭУ Уладзімір ШЫМАЎ. Гэтай падзеі папярэднічала калегія па пытаннях маладзёжнай палітыкі. У зале прысутнічалі прадстаўнікі студэнцкага актыву, члены БРСМ.*

На думку міністра, такія сустрэчы вельмі важныя: на іх удаецца пачуць, чым жыве моладзь, як адчувае дынаміку развіцця краіны. Палітыка дзяржавы адносна моладзі выражана вельмі дакладна: гэта стратэгічны рэсурс развіцця дзяржавы.

Міністр падкрэсліў, што сістэма адукацыі ў Беларусі выдатна фінансуецца. Сёлета бюджэт сферы адукацыі складае 7,1 % ад ВУП — гэта адзін з прыярытэтных напрамкаў развіцця нашай дзяржавы.

Міністр адукацыі адзначыў, што нельга ставіцца да сферы адукацыі без крытыкі. Дзякуючы выстаўцы распрацовак у сферы навучальных тэхналогій удалося ўбачыць слабыя моманты нашай сістэмы — напрыклад, недахоп лабараторна-тэхнічнага абсталявання. Але ў нечым мы мацнейшыя за іншых: у нас ствараюцца выдатныя падручнікі і навучальныя дапаможнікі.

На думку міністра, ёсць тры складнікі, якія забяспечваюць высокі ўзровень адукацыі:

1) традыцыі адукацыі, якія складваліся ў нашай краіне на працягу стагоддзяў і якія нельга рэзка мяняць;

2) якасць адукацыі, улік попыту вытворчасці;

3) улік сусветнага вопыту.

З дакладамі выступілі актывісты з розных куткоў краіны. Л.Арлоўская (III курс юрфака БДУ) расказала, як падтрымлівае сваіх студэнтаў вядучы універсітэт Беларусі. Студэнт БДЭУ С. Нялюбін прысвяціў свой даклад тэме другаснай занятасці студэнтаў. Д. Каваленка з Беларуска-расійскага універсітэта прапанавала стварыць адзіны маладзёжны Інтэрнэт-партал, што палепшыць выхаваўчую работу. Гамяльчанка В. Глямбоцкая звярнула ўвагу на злачыннасць у асяроддзі моладзі. Г. Кухто, студэнтка інстытута імя Сахарава, распавяла пра здаровы лад жыцця і прапанавала стварыць каардынацыйны савет студэнтаў розных ВНУ краіны.

Запамінальным акордам стаў выступ студэнта-медыка С. Дзянісава. Згодна з апытаннем, якое ён правёў у сваёй alma mater, 40 % першакурснікаў з’яўляюцца актыўнымі курцамі, прычым 45 % з іх — дзяўчаты. Будучы медык заклікаў ладзіць для такіх людзей наведванні НДІ анкалогіі: на яго думку, лепшай прапаганды здаровага ладу жыцця і не прыдумаеш.

Напрыканцы сустрэчы Аляксандр Радзькоў адзначыў, што такія сустрэчы павінны стаць традыцыйнымі. На развітанне рэктар БДУ В. Стражаў уручыў міністру, яго намесніцы і рэктару БДЭУ фотаздымкі, зробленыя падчас пасяджэння.

**Ала МАЧАЛАВА**
**Фота Юліі ПАПОВАЙ**



ВІНШУЕМ!

## ПАДЗЯКА АД РЭКТАРА

*У Міжнародны дзень студэнта, 17 лістапада, рэктар БДУ В.І. Стражаў сустрэўся з таленавітымі студэнтамі, якія дасягнулі выдатных поспехаў у навучанні, спорце, навуковых даследаваннях, а таксама міжнародных і рэспубліканскіх конкурсах і спаборніцтвах.*

*На сустрэчы Васіль Іванавіч распавёў пра гранты, якія атрымалі пераможцы конкурсу на найлепшы маладзёжны праект, а таксама абвясціў падзякі здольным і актыўным студэнтам нашага універсітэта.*

**У сувязі з вялікім асабістым укладам у грамадскае, культурнае і спартыўнае жыццё Беларускага дзяржаўнага універсітэта і ў сувязі з святкаваннем Міжнароднага дня студэнтаў падзякі рэктара атрымалі наступныя студэнты універсітэта:**

**Уладзімір БАСЬКО** — студэнт IV курса юрыдычнага факультэта, член студэнцкай творчай лабараторыі, Савета па прафілактыцы парушэнняў правілаў унутранага распарадку ў інтэрнатах, уладальнік Гран-пры Фестывалю студэнцкай песні “Срэбраныя струны”, пераможца штогадовага конкурсу студгарадка “Супермэн—2005”;

**Яўген ЯКІМЕНКА** — студэнт III курса факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, член грамадскай інфармацыйнай службы студгарадка, карэспандэнт студэнцкай відэастудыі “SVS”, старшыня інфармацыйнай камісіі студсавета інтэрната № 6, галоўны рэдактар малатыражнай газеты інтэрната № 6 “ФПМы”;

**Юрый МАТРОСАЎ** — студэнт III курса факультэта міжнародных адносін, артыст народнага драматычнага тэатра “На балконе”;

**Марыя КОПЦЕЛЬ** — студэнтка II курса філалагічнага факультэта, артыстка народнага фальклорнага ансамбля “Тутэйшая шляхта”;

**Віктар ІВАНОЎ** — студэнт III курса філалагічнага факультэта, артыст народнай харавой капэлы;

**Пётр СІТЧЫХІН** — студэнт III курса філалагічнага факультэта, артыст народнага музычнага тэатра “На філфаку”;

**Яўген ЛЫЧКОЎСКІ** — студэнт II курса фізічнага факультэта, артыст народнага аркестра народных інструментаў;

**Ганна РУСЕЦКАЯ** — студэнтка IV курса філалагічнага факультэта, вядучая ўпраўлення па справах культуры;

**Глеб ГАЛКІН** — студэнт III курса філалагічнага факультэта, вядучы ўпраўлення па справах культуры;

**Юлія ТРЫПУЦЬКА** — студэнтка II курса філалагічнага факультэта, лаўрэат фестывалю эстрады;

**Надзея КУХАРЧЫК** — студэнтка IV курса гістарычнага факультэта, артыстка народнага ансамблю танца “Крыжачок”;

**Андрэй БОКША** — студэнт I курса факультэта радыёфізікі і электронікі, член зборнай каманды БДУ па дзюдо;

**Аляксандра САВУРКА** — студэнтка II курса факультэта міжнародных адносін, член зборнай каманды БДУ па шахматах;

**Дзмітрый ЛЕБЕДЗЬ** — студэнт III курса гістарычнага факультэта, сакратар пярвічнай арганізацыі БРСМ гістарычнага факультэта;

**Настасся ГВАРДЫЯН** — студэнтка III курса механіка-матэматычнага факультэта, старшыня Студэнцкага саюза механіка-матэматычнага факультэта, намесніца старшыні камітэта Студэнцкага саюза БДУ.

**Падрыхтавала**
**Алена КУРХІНЕН**

## ПАГАДНЕННЕ З ХАРБІНСКІМ УНІВЕРСІТЭТАМ

*Пагадненне пра сумесную аспірантуру БДУ і Харбінскага ўніверсітэта навукі і тэхнікі (КНР) павінна быць падпісана сёння, 1 снежня. Подпісы пад дакументам паставяць кіраўнікі абедзвюх ВНУ прафесары В.І. Стражаў і Жао Цы.*

Дэлегацыя Харбінскага універсітэта на чале з рэктарам прыбыла ў Мінск 28 лістапада, падпісанне пагаднення пра сумесную аспірантуру — асноўная мэта візіту. У адпаведнасці з гэтым дакументам, паводле ўзгаднення з міністэрствамі адукацыі дзвюх дзяржаваў у нашым універсітэце будуць навучацца, а потым і абараняць ступені кандыдатаў навук прадстаўнікі Харбінскага універсітэта навукі і тэхнікі. У сумеснай аспірантуры прадугледжваецца падрыхтоўка кандыдатаў навук, студэнтаў для атрымання ступені магістра і непасрэдна саміх магістраў. Кітайскі бок бярэ на сябе ўсе выдаткі за навучанне, пражыванне, выплату стыпендый.

Акрамя таго, Харбінскі універсітэт навукі і тэхнікі ў аднолькавым парадку фінансуе будаўніцтва асобнага будынка агульнай плошчай 1000 кв.м для правядзення заняткаў і сумесных даследаванняў у названай аспірантуры.

Кітайскі бок прапанаваў падпісаць пагадненне тэрмінам на 10 гадоў з правам далейшага падаўжэння дзеяння гэтага дакумента.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

### СУПРАЦОЎНІЦТВА

# Госці з Сербіі

*Чатыры тыдні з візітам у БДУ знаходзілася дэлегацыя з Бялградскага ўніверсітэта.*

Як распавяла выкладчыца сербскай мовы філфака, кандыдат філалагічных навук **Святлана ГАЛЯК**, дагавор аб супрацоўніцтве паміж нашым і Бялградскім універсітэтамі існуе ўжо доўгі час, але менавіта апошнія месяцы былі насычаны цікавымі і вельмі прыемнымі падзеямі. Так, у маі студэнты славянскага аддзялення былі на моўнай практыцы ў Бялградзе. А ў лістападзе ўпершыню 14 сербскіх студэнтаў-русістаў і два выкладчыкі прыехалі да нас.

Узначаліла дэлегацыю прафесар Бялградскага універсітэта, доктар філалагічных навук **Зорка КАШЫЧ**. Падчас знаходжання ў Мінску яна працавала з нашымі студэнтамі па самых цяжкіх напрамках у вывучэнні сербскай мовы — вымаўленне, асаблівы музычны націск. А сербскія студэнты, акрамя заняткаў па рускай мове, праслухалі курс гісторыі культуры Беларусі. У дадатак да гэтага знаёмства з краінай для іх была арганізавана багатая культурная праграма.

Наступныя праекты гэтага плённага супрацоўніцтва — абмен выкладчыкамі. Святлана Галяк збіраецца чытаць у Бялградзе курс лекцый па супастаўленні трох моў — сербскай, рускай і беларускай. У перспектыве плануецца абмен дэлегацыямі з іншых факультэтаў. Гэты дагавор працуе дзякуючы падтрымцы адміністрацыі універсітэта, філфака і пасольства Сербіі і Чарнагорыі.



У перадапошні дзень знаходжання дэлегацыі ў Мінску Зорка Кашыч распавяла пра свае ўражанні ад паездкі.

**— Вы дагэтуль бывалі ў Мінску?**

— Я ўпершыню ў Беларусі. Зямля, людзі, Мінск — усё мне вельмі спадабалася. А ваш горад — самы чысты на свеце!

**— А якія ўражанні ад філалагічнага факультэта?**

— На філфаку я адчуваю сябе як дома. Я шмат даведалася ад калег-філолагаў тут, у Мінску. За гэтыя чатыры тыдні я пазнаёмілася з вельмі добрай арганізацыяй філфака, з зацікаўленымі студэнтамі, якія вывучаюць маю родную мову. У мяне было шмат заняткаў са студэнтамі — першакурснікамі, пяцікурснікамі. У іх вельмі высокі ўзровень валодання сербскай мовай.

**—Дзе вы яшчэ пабывалі, што пабачылі?**

— У нас была вялікая культурная праграма. Мы былі ў Жыровічах, Слоніме, Міры, Заслаўі. У Мінску пабывалі ў некалькіх музеях, пазнаёміліся з творчасцю М. Шагала, схадзілі на балеты "Лебядзінае возера" і "Рамэо і Джульета", былі ў Купалаўскім тэатры, цырку (я і не чакала, што мне так спадабаецца!), манастырах, на канцэрце ДДТ, мюзікле "Чыкага", паглядзелі рок-оперу "Юнона і Авось". Вельмі цудоўныя ўражанні ад усяго!

**Настасся ЮДЧЫЦ**

**На фота аўтара: Святлана Галяк і Зорка Кашыч**

## ПАДПІСКА — 2006

## "ВЕСНІК БДУ"

*Пачалася падпіска на перыядычныя выданні на першае паўгоддзе 2006 года.*

**Падпісная цана на часопіс "Веснік БДУ" па серыях:**

**Серыя I** — фізіка, матэматыка, інфарматыка (№ 1, студзень; № 2, май):

індывідуальная (індэкс 74851) — 15 780 р.;

ведамасная (індэкс 748512) — 43 097 р.

**Серыя II** — хімія, біялогія, геаграфія (№ 1, люты; № 2, чэрвень):

індывідуальная (індэкс 74852) — 15 780 р.;

ведамасная (індэкс 748522) — 43 097 р.

**Серыя III** — гісторыя, філасофія, псіхалогія, паліталогія, сацыялогія, эканоміка, права (№ 1, сакавік):

індывідуальная (індэкс 74853) — 7 890 р.;

ведамасная (індэкс 748532) — 21 548 р.

**Серыя IV** — філалогія, журналістыка, педагогіка (№ 1, красавік):

індывідуальная (індэкс 74854) — 7 890 р.;

ведамасная (індэкс 748542) — 21 548 р.

**Падпісацца на часопіс "Веснік БДУ" можна ва ўсіх аддзяленнях сувязі Рэспублікі Беларусь.**

Часопіс "Веснік БДУ" ўсіх чатырох серый можна набыць:

у кіёску галоўнага корпуса БДУ (прасп. Незалежнасці, 4);

у кіёску «Універсітэцкая кніга» (вул. Ленінградская, 2);

у кнігарні "Акадэмічная кніга" (прасп. Незалежнасці, 72, тэл. 232-00-52);

серыі 3, 4 — у кіёску па вул. К. Маркса, 31 (будынак гуманітарных факультэтаў БДУ).

**Самы танны і надзейны спосаб атрымаць часопіс — гэта падпіска.**

### ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТАЎ

# ДЗЕНЬ ПРАКТЫКІ НА ЖУРФАКУ

*Канферэнцыя па выніках вытворчай практыкі студэнтаў факультэта журналістыкі адбылася 24 лістапада.*

З творчай прэзентацыяй выступілі студэнты-старшакурснікі Кацярына Расолька, Дзмітрый Альфер, Ірына Прымак, Ірына Чарнабай, Алег Гаруновіч, Аляксандр Налівайка, Сяргей Бегіян, Ганна Ялфімава, Настасся Панкратава. У канферэнцыі прынялі ўдзел супрацоўнікі вядучых сродкаў масавай інфармацыі: галоўны рэдактар газеты "Звязда" У.Б. Наркевіч, галоўны рэдактар "Народнай газеты" У.У. Андрыевіч, генеральны дырэктар Беларускага радыё П.Ф. Раманчук, в.а. галоўнага рэдактара газеты "Знамя юности" В.П. Ерашэнка, галоўны рэдактар газеты "Переходный возраст" Г.Б. Пшонік, галоўны рэдактар газеты "Раніца" С.У. Яскевіч, галоўны рэдактар газеты "Зорька" Л.М. Грамовіч, дырэктар прадстаўніцтва МДТРК "Мір" у Беларусі Л.Л. Сідаровіч, праграмны дырэктар радыё "Мінская хваля" А.В. Мазур, адказны сакратар УП "Агенцтва "Мінск-Навіны" А.Л. Каравайка, намеснік адказнага сакратара радыёпраграмы "Радыё—Мінск" В.Ю. Юрачка.

Падчас канферэнцыі працавалі "круглыя сталы" па спецыяльнасцях: "Расцём з "Народнай газетай", "Студэнт-практыкант на абласным радыё і тэлебачанні" "Інстытут PR у сацыяльнай камунікацыі як база практыкі для спецыяльнасці "Інфармацыя і камунікацыя", "Дзейнасць філіяла кафедры замежнай журналістыкі і літаратуры ў рэдакцыі газеты "Голас Радзімы", "Выдавецкая справа на Беларусі: перспектывы і праблемы". Акрамя таго, ладзіліся майстар-класы па спартыўнай журналістыцы (супрацоўнікі штотыднёвіка "Прессбол" С. Новікаў, С. Парамыгіна, С. Канашыц, каментатар БТ У. Навіцкі), па фотажурналістыцы (фотакарэспандэнты газет "Рэспубліка" В. Стралкоўскі і "Народнай газеты" А. Шаблюк), "Вядучы тэлебачання" (ды-джэй "Альфа-радыё" і вядучая Першага нацыянальнага тэлеканала Тамара Лісіцкая), "Прафесія ды-джэй" (ды-джэй "Радыус FM" Аляксандр Барсаў, ды-джэй "Альфа-радыё" Слава Бандарэнка).

Студэнты, якія атрымалі найбольш высокія водгукі ад кіраўнікоў па выніках практыкі, былі ўзнагароджаны граматамі, каштоўнымі прызамі і падарункамі.

**Алена КУРХІНЕН**

# САЦЫЯЛОГІЯ: МІНУЛАЕ І СУЧАСНАСЦЬ

*Сустрэча студэнтаў аддзялення сацыялогіі з вядомымі сацыёлагамі адбылася на пачатку лістапада на факультэце філасофіі і сацыяльных навук БДУ. Мерапрыемства прысвячалася 40-годдзю аднаўлення айчыннай сацыялагічнай навукі.*

Кафедра сацыялогіі і першабытнай культуры была створана яшчэ ў 1921 г., тады актыўна ладзіліся сацыялагічныя даследаванні, выходзілі манаграфіі і падручнікі. Аднак у 30-я гады сацыялогія пазбылася статусу самастойнай навуковай дысцыпліны. Толькі ў сярэдзіне 60-х склаліся ўмовы, спрыяльныя для адраджэння айчыннай сацыялогіі: 9 лістапада 1965 г. ЦК КПБ прыняў пастанову "Аб арганізацыі канкрэтна-сацыялагічных даследаванняў у рэспубліцы". Гэты дакумент стаў пропускам у прафесійную дзейнасць для цэлага пакалення навукоўцаў-сацыёлагаў.

У сваёй прамове загадчык кафедры сацыялогіі БДУ член-карэспандэнт НАН Беларусі А. Данілаў пазнаёміў студэнтаў з праблемамі, якія вырашае сацыялагічная навука ў сучасным грамадстве. Пра гісторыю беларускай сацыялогіі распавялі першы загадчык кафедры сацыялогіі, доктар філасофскіх навук, прафесар А. Елсукоў і заслужаны дзеяч адукацыі Беларусі, доктар філасофскіх навук, прафесар Г. Сакалова. Намеснік дырэктара Інстытута сістэмных даследаванняў праблем моладзі і адукацыі БДУ, кіраўнік Цэнтра сацыялагічных і палітычных даследаванняў доктар сацыялагічных навук, прафесар Д. Ротман засярodзіў увагу на ўдзеле беларускіх сацыёлагаў у міжнародных даследаваннях. Пра дзейнасць Праблемнай навукова-даследчай лабараторыі сацыялагічных даследаванняў БДУ распавяла прысутным кандыдат юрыдычных навук, дацэнт кафедры сацыялогіі С. Бурава.

**Н.В. КУРЫЛОВІЧ,**
**старшыня Савета па НДРСА ФФСН**

## ЧАСОПІС ДЛЯ САЦЫЁЛАГАЎ

Навукова-тэарэтычны часопіс "Социология" — першае ў Рэспубліцы Беларусь перыядычнае выданне па пытаннях сацыялогіі. У ліку аўтараў часопіса вядучыя сацыёлагі Беларусі, Расіі, Украіны, іншых краінаў СНД, а таксама ЗША, Германіі, Вялікабрытаніі, Аўстрыі, Польшчы і інш.

Часопіс уключаны Прэзідыумам ВАК Беларусі ў лік выданняў для публікацыі матэрыялаў пры абароне кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый.

Часопіс разлічаны на чытачоў, якія спецыялізуюцца ў галіне сацыялогіі, а таксама сумежных галін навукі: выкладчыкаў, навуковых супрацоўнікаў, аспірантаў, студэнтаў, спецыялістаў-практыкаў.

Перыядычнасць выхаду часопіса — 1 раз у квартал.

Цана падпіскі на навукова-тэарэтычны часопіс "Социология" на паўгоддзе складае:

для індывідуальных падпісчыкаў — 14.580 руб. (кошт аднаго нумара 7290 руб.). Падпісны індэкс — 74932;

для ведамаснай падпіскі — 40.522 руб. (кошт аднаго нумара 20.261 руб.). Падпісны індэкс — 749322.

**Падпісацца на часопіс "Социология" можна ва ўсіх аддзяленнях сувязі РА "Белпошта" Рэспублікі Беларусь ("Каталог газет і часопісаў Рэспублікі Беларусь на першае паўгоддзе 2006 г.", с. 236).**

**Рэдакцыя часопіса**

ПОМНІКІ БДУ




*Газета "Універсітэт" працягвае знаёміць чытачоў з жыццёвымі і творчымі лёсамі асветнікаў, чые скульптуры ўпрыгожваюць універсітэцкі дворык. Сённяшні наш расповед — пра беларускага мысліцеля-гуманіста эпохі Рэфармацыі Сымона БУДНАГА.*

# ДРУКАР З НЯСВІЖА



Сымон Будны — беларускі мысліцель-гуманіст эпохі Рэфармацыі, рэлігійны рэфарматар, таленавіты пісьменнік, педагог і філосаф, багаслоў і прапаведнік, імя якога ў XVI ст. было шырока вядомае ў Англіі, Нямеччыне, Італіі ды іншых краінах Заходняй Еўропы.

Лічыцца, што Будны нарадзіўся ў 1530 г. і выходзіць з дробнашляхецкага саслоўя. У 14-гадовым узросце будучы знакаміты мысляр-гуманіст паступіў на факультэт вольных мастацтваў Кракаўскага універсітэта. Правёўшы ў ягоных сценах блізу 10 гадоў, Будны атрымаў выдатную адукацыю, потым, магчыма, ён скончыў тэхналагічны факультэт Базельскага універсітэта, вучыўся і ў іншых еўрапейскіх універсітэтах, з 1558 г. пры спрыянні беларускага магната Мікалая Радзівіла — прыхільніка Рэфармацыі, выкладаў на беларускай мове асновы тэалогіі ў Віленскім пратэстанцкім зборы, а з 1560 г. быў кальвіністкім прапаведнікам у Клецку, Нясвіжы.

Сымон Будны быў надзвычай адукаваным чалавекам. Апрача беларускай мовы, ён выдатна валодаў класічнай лацінай, іўрытам, а таксама грэцкай, стараславянскай, польскай ды іншымі мовамі, што давало яму паглыбляць свае веды ў антычных культурах, аналізаваць дасягненні культуры Сярэднявечча, без цяжкасцяў знаёміцца з творамі Эразма Ратэрдамскага, Марціна Лютэра, Жана Кальвіна і іншых заходнееўрапейскіх філосафаў і пісьменнікаў.

Разам з нясвіжскім старастам Мацеем Кавячынскім і кальвіністкім прапаведнікам Лаўрэнам Крышкоўскім пры фінансавай падтрымцы магнатаў Астафея Валовіча і Мікалая Радзівіла Чорнага Будны заснаваў у 1562 г. у Нясвіжы адну з першых у Беларусі друкарняў. Сюды з Вільні быў перавезены шрыфт, якім у свой час карыстаўся Ф. Скарына. Пры друкарні з'явілася паперня. Ужо 10 чэрвеня 1562 г. з нясвіжскай друкарні выйшла першая кніга Буднага — "Катехисис, то ест наука стародавная христианская от светого писма, для простых людей языка руского, в пытаниях и отказех собрана".

Новы перыяд у жыцці Буднага пачаўся ў Холхаве (1565-1566 г.). Ён стаў адным з ідэйных правадыроў беларускай Рэфармацыі і ўзначаліў яе радыкальную плынь — антытрынітарыяў. Як ідэолаг правага крыла літоўскіх братоў (беларускіх і літоўскіх антытрынітарыяў) Будны займаў у спрэчках памяркоўна-гуманістычную пазіцыю.

Галоўнымі ў яго творчай дзейнасці гэтага часу былі пераклад Біблії і апокрыфаў на старазапаветныя і новазапаветныя тэмы. Каля 1570-1571 г. Будны з невядомых сёння прычынаў пераехаў з Холхава ў Заслаўе, дзе жыў больш за год. У Заслаўі 15 чэрвеня 1572 г. асветнік скончыў працу над перакладам Старога Запавету.

Залатой парой у творчасці Сымона Буднага стаўся перыяд з 1573 да 1583 г., калі ён жыў у Лоску ў доме магната Яна Кішкі. Увосень 1573 г. той прапанаваў яму пасаду міністра (прапаведніка) у Лоску, заснаваў там друкарню і аддаў яе ў поўнае распараджэнне Буднага. У 1574 г. у лоскай друкарні ўпершыню ў сусветнай літаратуры выйшаў Новы Запавет з прадмовай, каментарыямі і заўвагамі. Ніхто з тагачасных еўрапейскіх перакладчыкаў новазапаветных твораў не рабіў дагэтуль такой велізарнай тэксталагічнай працы, як Сымон Будны. Дзякуючы фенаменальным аналітычным здольнасцям беларускага асветніка, ягонаму таленту, шырокай эрудыцыі,



дасканаламу веданню старажытных моваў, навукова-крытычны ўзровень выдання Новага Запавету 1574 г. быў самым высокім сярод усіх вядомых на той час у Еўропе.

15 жніўня 1576 г. Будны надрукаваў у Лоску свой галоўны тэалагічны трактат "Аб найгалоўнейшых палажэннях хрысціянскай веры". У гэтым творы мысляр падагульніў свае рэлігійна-філасофскія погляды. Ён адстойваў чалавечую прыроду Хрыста, выступаў супраць незямнога свету, замагільнага жыцця, Боскай Тройцы, з пазіцый антрапацэнтрызму тлумачыў маральны выбар чалавека: не страхам перад замагільным жыццём ці пасмяротнымі пакутамі, а розумам і свядомасцю. Будны лічыў, што і без дапамогі царквы чалавек можа дасягнуць маральнай дасканаласці.

Творы Буднага мелі вялікую папулярнасць сярод жыхароў Беларусі. Ягоныя казанні з ахвотаю слухалі мяшчане Вільні, Клецка, Нясвіжа, Холхава, Заслаўя, Лоска, Любчы, Полацка, Вішнева...

Ён не разлічваў на шчодрыя ўзнагароды і не шукаў лаўраў лепшага перакладчыка. "Якая ласка мне будзе, — пісаў ён, — не ведаю. Але пра тое зусім не дбаю. Мне досыць ужо таго, што не закапаў майго малога таленту, а прынёс карысць... Усю маю працу няхай ацэняць наступныя пакаленні".

Грамадска-палітычныя погляды Буднага былі гуманістычнымі. Асветнік выступаў за вызваленне чалавечага духу, за свабодную стваральную працу. Ён заклікаў грамадзян паважаць дзяржаўныя законы, шанаваць бацькоўскую зямлю і матчыну мову, сумленна выконваць свае абавязкі, жыць паводле Божых запаветаў.

Ён прызнаваў прыватную ўласнасць, саслоўна-класавую няроўнасць, феадальную залежнасць сялян, але крытыкаваў феадальнае сваволства, беззаконне, захопніцкія войны, быў абаронцам верацярпімасці і інтэлектуальнай свабоды. Ідэі Сымона Буднага аб развіцці беларускай мовы, культуры былі адным з фактараў станаўлення нацыянальнай самасвядомасці, а яго эстэтычныя погляды насілі рацыянальны характар: цудоўнае тое, што існіннае.

"Сапраўдны хрысціянін", на думку Буднага, мог займаць дзяржаўныя пасады, звяртацца ў суды, паколькі гэтыя інстытуты не супярэчаць евангельскаму вучэнню. Палітычны ідэал яго — "філосаф на троне", асвечаны манарх, які "павінен акружаць сябе мудрымі і вучонымі людзьмі, з якімі б ён мог параіцца, як дзейнічаць у цяжкіх абставінах". Войны ён падзяляў на справядлівыя, у якіх рэкамендаваў прымаць удзел, і несправядлівыя, якія асуджаў.

Сацыяльна-палітычныя і прававыя ідэі Сымона Буднага паўплывалі на вядомых юрыстаў, тагачасных дзяржаўных дзеячаў — Астафея Валовіча і Льва Сапегу, якія вызначалі дактрыну Статута 1588 г. У многім дзякуючы Будному ў Статуце знайшлі адлюстраванне ідэі прэзумпцыі невінаватасці, царкоўна-рэлігійнай талерантнасці і вяршэнства закона.

Сымон Будны выявіў сябе як выдатны майстра паэтычнай "эпіграмы". Ствараючы панегірыкі на гербы беларускіх магнатаў, паэт вытрымліваў каноны эмблематычнай паэзіі, прынятыя ў заходнееўрапейскіх літаратурах. Дзякуючы менавіта Сымону Буднаму "эпіграмы" на гербы сталі неад'емнай рысай лацінамоўнай літаратуры Беларусі. Гэтую традыцыю, але ўжо на беларускай мове пазней працягнулі паэты барока А. Рымша, Л. Мамоніч, М. Смятрыцкі, С. Собаль і інш.

Апошнія гады жыцця Будны правёў пры дварах выпадковых мецэнатаў. Да 1956 г. дакладная дата смерці філосафа не была вядома. Яе вызначыў Станіслаў Кот. У каралеўскай бібліятэцы Капенгагена ён знайшоў выдадзены Міхалам Алясніцкім у 1603 г. у Вільні твор, накіраваны супраць антытрынітарыяў. Аўтар піша, што смерць асветніка 13 студзеня 1593 г. была вельмі пакутнай...

На сёння ў Нясвіжы захаваўся будынак, дзе месцілася друкарня Сымона Буднага. Непадалёку ад яго стаіць помнік выдатнаму гуманісту і асветніку. Скульптура Буднага, пастаўленая Святланай Гарбуновай, — гэта ідэал мудрага настаўніка, абаяльнага і фізічна моцнага, здольнага ўсё зрабіць уласнымі рукамі мужчыны. Кампазіцыя манумента надзвычай простая: чалавек паказвае адной рукою на справу свайго жыцця — кнігу. Другая рука, нібы прысягаючы на нябёсах, заклікае неба ў сведкі, што справа тая неўміручая. Яго імя ўключана ў каляндар міжнародных датаў славутых дзеячаў славянскай культуры ЮНЕСКА.

Падрыхтавалі
Таццяна ВАДАП'ЯНАВА
і Ірына ШЫК
Фотаздымкі Юліі ПАПОВАЙ

## ПОМНІК С. БУДНАМУ І В. ЦЯПІНСКАМУ "ДЫСПУТ"

Прапанова, ажыццяўленне агульнай канцэпцыі і праекта помніка двум вялікім дзеячам эпохі Рэфармацыі належыць Анатолю Беламу. Працаваў над лепкай помніка скульптар Ігар Голубеў.

30 кастрычніка 2000 г. помнік, адліты на трактарным заводзе, устанавілі на часовы драўляны памост. У той жа дзень з нагоды 79-годдзя БДУ адбылося яго ўрачыстае адкрыццё.

Незвычайнасць праекта — свабодная месца паміж Будным і Цяпінскім, якое можа заняць любы студэнт, каб паўдзельнічаць у дыскусіі двух вялікіх беларусаў.

## КНІЖНАЯ ПАЛІЦА

# ВЫДАДЗЕНА Ў БДУ

*В.А. Цяплова, А.Г. Каханоўскі, І.Л. Грыбко.* **Гісторыя Беларусі XIX ст.** У вучэбна-метадычным комплексе адлюстроўваецца аўтарская канцэпцыя гісторыі Беларусі XIX ст. У выданні ўлічваюцца сучасныя падыходы да аналізу гістарычных падзей, а таксама асаблівасці і вопыт выкладання навучальнага курса для студэнтаў гістарычнага факультэта.

*Л.Л. Михайловская, Д.И. Лазарева.* **История западных славян с древнейших времен до 1914 г.** Вучэбна-метадычны комплекс змяшчае матэрыялы па гісторыі заходніх славян, складаецца з двух модуляў, якія ўключаюць праграму курса, канспект лекцый, тэматыку семінарскіх заняткаў і метадычныя рэкамендацыі, тэсты, храналагічны даведнік, пытанні для самакантролю.

*О.А. Симакова, А.П. Сальков, С.С. Александрович.* **История южных славян с древнейших времен до 1914 г.** Навучальны дапаможнік з грыфам Міністэрства адукацыі асвятляе пытанні сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця Балгарыі, Сербіі, Чарнагорыі, Харватыі, Босніі і Герцагавіны, Славеніі, Македоніі ў перыяд са старажытных часоў да 1914 г. Гісторыя паўднёваславянскіх народаў разглядаецца ў кантэксце стварэння і развіцця шматлікіх нацыянальных дзяржаў, у склад якіх яны ўваходзілі.

*Е.К. Тарасова.* **Тактика следственного эксперимента.** У навучальным дапаможніку выкладаецца тэарэтычны матэрыял аб арганізацыйных і тактычных сродках, неабходных для правядзення следчага эксперыменту.

*Л.П. Саенкова.* **История искусств. Конец XIX — первая половина XX века.** У канспекце лекцый падаецца гісторыя развіцця розных відаў заходнееўрапейскага і рускага мастацтва — архітэктура, жывапіс, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.

**Порядок подготовки и выпуска малотиражной учебно-методической литературы в Белорусском государственном университете. Памятка автору.** У выданні, прызначаным для выкладчыкаў (аўтараў), метадыстаў, тэхнічных работнікаў, выкладаюцца асноўныя патрабаванні па падрыхтоўцы і выпуску навучальна-метадычнай літаратуры сродкамі малатыражнага друку.

*В.И. Дунай, А.Н. Антоненко, Б.Тщентке.* **Физиология с основами анатомии человека. Регуляторные системы.** У курсе лекцый разглядаюцца будова і функцыі нервовай, эндакрыннай і тэрмарэгулятарнай сістэм арганізма чалавека.

**Беларускі дзяржаўны універсітэт у гады Вялікай Айчыннай вайны 1941—1945.** У кнізе з серыі "Памяць і слава" адлюстраваны гераічныя падзеі з гісторыі БДУ ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны.

**Российские и славянские исследования. Выпуск I.** Са зборніка навуковых артыкулаў можна даведацца пра найноўшыя распрацоўкі беларускіх і замежных славістаў па праблемах расійскай і славянскай гісторыі.

**Юрыдычны факультэт: Гісторыя. Сучаснасць. Імёны.** У кнізе прадстаўлена гісторыя развіцця юрыдычнага факультэта, дзейнасць кафедраў і вучэбных лабараторый. Бібліяграфічная частка змяшчае звесткі пра выкладчыкаў і асобныя кірункі іх навуковай дзейнасці.

**Упраўленне рэдакцыйна-выдавецкай работы**

## АСОБЫ

*Ліцэй БДУ вядомы сваімі традыцыямі. Адна з іх — штогадовае абранне найлепшага настаўніка, што адбываецца на прафесійнае свята, у кастрычніку. У 2005 г. найлепшай настаўніцай стала выкладчыца беларускай літаратуры Вераніка Вячаславаўна КУШНЯРЭВІЧ.*



# НАЙЛЕПШАЯ НАСТАЎНІЦА ЛІЦЭЯ

**— Хто з бацькоў больш паўплываў на вас?**

— Я пайшла па бацькавай сцяжынцы. Бацька — беларускі філолаг, ён схіліў мяне на свой бок. У нас заўсёды любілі літаратуру — рускую, замежную. Любоў да беларускай літаратуры прыйшла пазней, але яна вельмі моцная, трывалая.

Усяму, што я ўмею ў жыцці, навучыла мяне маці, патомная інтэлігентка. Яна скончыла біялагічны факультэт нашага універсітэта, бацька скончыў філалагічны факультэт. Там яны і пазнаёміліся.

— Калі я прыходжу ў ліцэй, я забываюся на ўсё астатняе. І я вельмі ўдзячная Г.У. Пальчыку, што ён запрасіў мяне, супрацоўніцу Нацыянальнага інстытута адукацыі, на працу ў ліцэй. Я адчула, што я на сваім месцы, гэта маё.

**— Адкуль узялася канцэпцыя вашых урокаў?**

— У маладой настаўніцы пасля заканчэння Педагагічнага універсітэта, яшчэ не было ніякай канцэпцыі. Была праца над сабой. З узростам я прыйшла да меркавання: калі чалавек не расце, не эвалюцыянуе, спыняецца на дасягнутым, тады пачынаецца дэградацыя — і навуковая, і прафесійная. Трэба расці, цікавіцца навінкамі — тым, што напрацоўваюць нашы літаратуразнаўцы. З цягам часу ў мяне намалявалася карціна: хто чаго варты, хто якое займае месца, хто які зрабіў уклад, які крок зрабіла наперад наша літаратура, дзякуючы гэтаму пісьменніку.

Другім настаўнікам я лічу сваю бабулю. Яна заўсёды вітала маё чытанне, заўсёды чытала і мяне заахвочвала, прасіла пачытаць уголас. Трэці мой настаўнік — гэта кнігі.

**— Чаму вы звязалі жыццё з беларускай літаратурай?**

— Я скончыла англійскую школу, беларускую мову пачала вывучаць толькі з трэцяга класа. Але, мусіць, адыграў ролю асяродак: дома былі такія кнігі, якія цяжка было дастаць. Мае аднагодкі і ў школьныя, і ў студэнцкія гады нічога не чулі ні пра Уладзіміра Дубоўку, ні пра Уладзіміра Жылку, ні пра Леанілу Чарняўскую — у нас жа гэтыя кнігі былі ў доме.

**— Бацька кіраваў вашым чытаннем?**

— Ён падкладаў мне кнігі, і я чытала. Бацька заўсёды прымушаў мяне звяртацца да даведачнай літаратуры. Робіш якую-небудзь працу, сачыненне пішаш: "Што азначае гэтае слова?" А бацька ў адказ: "Паглядзі ў слоўнік, у энцыклапедыю". Так урэшце сфарміравалася звычка працы з даведачнай літаратурай.

**— Вы жывяце толькі працай?**

**— Па якім крытэрыі вы ацэньваеце свае ўрокі?**

— Галоўнага крытэрыя няма. Адзін з такіх крытэрыяў — наколькі ты здолееў завабіць маладога беларуса беларускай літаратурай. Я вельмі рада, калі бачу, што будучы філолаг ці гісторык зацікавіўся і яму не абыякава, што тут пісалася і хто тут пісаў, пачынаючы з XI ст.

**— Вы працуеце ў ліцэі амаль з самага пачатку. Які быў ліцэй у мінулым і зараз? І паспрабуйце ўявіць яго ў будучым.**

— Ліцэй — гэта людзі, калектыў аднадумцаў. Мне хацелася б, каб гэта захавалася і ў будучым. У гэтым умова далейшага жыцця ліцэя. Новыя будынкі, новая мэбля, новыя тэхналогіі ў навучанні — усё мяняецца. Аснову заўсёды складаюць людзі, іх патэнцыял.

**— Вучні мяняюцца. Якія рысы ў іх губляюцца, а якія становяцца відавочнымі?**

— На пачатку 90-х вучні здаваліся больш дарослымі, не было ў іх уласцівай усім дзецям інфантыльнасці. Сёння дзеці сталі больш прагматычнымі. Тэставая сістэма кантролю ведаў па ўсіх прадметах выпрацоўвае зусім іншы склад мыслення: дзеці пачынаюць мысліць коратка, ясна і па тэме. А будучы філолаг, гісторык, журналіст, сацыёлаг, філасаф — чалавек, які павінен умець разгарнуць тэзіс, доказна маналагічна асвятляць яго. Гэтага нашы вучні, на жаль, не ўмеюць. Бачны разлом паміж папярэднім пакаленнем і тымі, што прыйшлі ў гэтым годзе навучацца. Дзецям вельмі цяжка маналагічна гаварыць — яны прывыклі пісаць. І я бачу небяспеку ў павальным захапленні тэстамі. Хоць і не адмаўляю іх як від працы. Але толькі як адзін з відаў праверкі на ўроку. Суцэльны пераход на тэсты прынясе і вялікую шкоду. Асабліва ў гуманітарнай сферы.

**— Хто ваш любімы аўтар?**

— У роднай літаратуры — Уладзімір Караткевіч. Ён вельмі моцна паўплываў на мяне, як на асобу. У сусветнай літаратуры зараз я Маркеса з задавальненнем чытаю. Альбер Камю — аўтарытэт, якога я магу чытаць, атрымоўваючы асалоду.

**— Цяжка ўявіць сабе філолага без бібліятэкі...**

— Калісьці я карысталася бацькавай бібліятэкай, але зараз склалася ўласная. Там тое, што я люблю, што мне патрэбна для работы. Кніжкі паступова выцясняюць нас з хаты, не змяшчаюцца ў кніжную шафу. Але бібліятэка наша вельмі практычная, прыстасаваная для нас.

**— Як вы бавіце час?**

— Вельмі люблю тэатр. Няма такой п'есы ў Купалаўскім тэатры, якую б я не паглядзела. Не прапускаю мастацкіх выстаў. А пасля працы ўвесь час аддаю мужу, сыну.

**Любоў КУРЫЛА,**
**вучаніца ліцэя БДУ**
**Фота аўтара**

## ПОСТФАКТУМ

# ЛІЦЭЙ ВАЮЕ З ЦЫГАРЭТАЙ

18 лістапада ў ліцэі БДУ адбылося адмысловае свята, арганізаванае адміністрацыяй з просьбы саміх вучняў. У гэты дзень адзначаецца такая ліцэйская традыцыя, як Helloday: у ліцэі працуе пошта, навучэнцы могуць адпраўляць запіскі сваім сябрам, а таксама настаўнікам, могуць прызнацца ў каханні ці якіх іншых пачуццях адзін аднаму. Карацей, свята вельмі вясёлае і цікавае.

Але ў гэтым годзе надзвычай сур'ёзныя і адказныя ліцэісты прапанавалі правесці акцыю па барацьбе з курэннем: апошнім часам нават у такой адукацыйнай установе ўзнікла сур'ёзная праблема, выкліканая тытунёвым дымам. Цэлы тыдзень усе рыхтаваліся, а ў пятніцу ўжо на калідорах з'явіліся звароты да вучняў, у якіх настаўнікі лагічна і аргументавана даводзілі да нашай свядомасці, як гэта дрэнна — курыць. На кожным перапынку ліцэйскае радыё расказвала цікавую інфармацыю пра табаку, а на трэцім паверсе вісеў страшэнны плакат з фотаробатам чалавека, які курыць больш за 20 год. А для злосных курыльшчыкаў былі прапанаваны 10 спосабаў, як кінуць ганебную звычку.

Дзень атрымаўся вельмі пазнавальны і карысны, а каб агульнае ўражанне не было зусім ужо чорным, увечары адбылася дыскатэка. Можа мне падалося, але цяпер курыць у ліцэі сталі значна менш.

**Любоў КУРЫЛА,**
**вучаніца 11 класа ліцэя БДУ**

## НАВІНЫ СТУДГАРАДКА

# А СТУДЭНТЫ — МАЦНЕЙШЫЯ!

На працягу двух тыдняў у студгарадку БДУ адбываліся спаборніцтвы на Кубак дырэкцыі. За права атрымаць узнагароду змагаліся дзве каманды — студэнтаў і супрацоўнікаў. Змаганне адбывалася ў такіх відах спорту, як перацягванне каната, боўлінг, тэніс, міні-футбол, валейбол, більярд, баскетбол. З лікам 4:3 перамагла каманда студэнтаў і атрымала Кубак. Аднак менш чым праз паўгода каманда супрацоўнікаў зможа ўзяць рэванш: наступнае спаборніцтва павінна адбыцца ўжо ўвесну.

**Паводле інфармацыі грамадскай інфармацыйнай службы студгарадка БДУ**



## У ВОЛЬНЫ ЧАС

# ВОСЬ ТАКІЯ ПЕРНІКІ

У рамках святкавання Дня студэнта прайшоў рок-фестываль "Такія пернікі". Арганізатарамі мерапрыемства выступіла кіраўніцтва БДУ і адміністрацыя Маскоўскага раёна сталіцы.

Фестываль адбываўся ў некалькі этапаў. У першым ўзялі ўдзел 27 калектываў (138 чалавек). У другі тур прайшлі толькі 18 гуртоў. А ў фінале, які адбыўся ў мінскім клубе "Night Star", змагаліся найлепшыя 7 камандаў. Кожны з гуртоў (Litesound, Parason, Iris 7, Traffic Jem, Antidote, ChifsBand ды Zeitnot) выканаў па дзве песні. Акрамя ўдзельнікаў выступілі і гурты-госці — "Сініца" і "Айскрымаў".

Права ўзнагародзіць пераможцаў атрымалі прарэктар па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях У.В. Сувораў і начальнік аддзела культуры адміністрацыі Маскоўскага раёна А.А. Бялоў. Трэцяе месца заняў гурт Antidote, другое — Litesound, а на першае выйшаў ChifsBand. Дарэчы, гэты гурт таксама атрымаў прыз як "Самы артыстычны". Пераможцы фэсту атрымалі 5-кілаграмовыя пернікі, а ўладальнікі першага месца — яшчэ і магчымасць бясплатна запісаць песню на прафесійнай студыі.

**Юлія ПАПОВА**

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года
Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР
Газета зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 30 жніўня 2005 года
1 снежня 2005 года
Падпісана да друку 30.11.2005 г.
Зак.1112 . Тыраж 1000 экз. Ум. друк. арк. 1
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ"
ЛП № 02330/0056850 ад 30.04.2004.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6
Рэдактар Таццяна КАЗАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная рэдакцыі: вул. Бабруйская, 7, пакой 411, тэлефон 209-53-45,
e-mail: Gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by